На наш взгляд, основными и самыми эффективными методами по выработке орфографической зоркости являются следующие: комментированное письмо – помогает учащимся самостоятельно объяснить написание орфограммы; письмо с проговариванием – помогает избежать ошибок и объединяет класс; письмо с пропуском орфограммы – позволяет пропустить место орфограммы в слове и после вернуться к её объяснению; какографическая работа – формирует навык находить ошибки в уже готовом тексте; различные виды списывания (осложнённое или неосложнённое); различные виды обучающих диктантов (предупредительный, объяснительный, словарный, выборочный и др.); работа со словарными словами и работа над ошибками; орфографический разбор.

Каждый из этих методов подходит для конкретной ситуации на уроке русского языка.

Следует отметить, что «орфографическая зоркость формируется, развивается постепенно, в процессе языкового анализа и синтеза, выделения звуков и букв, морфем при чтении, при письме диктантов, при списывании, если оно осложнено заданиями. При систематической отработке зоркость становится компонентом навыка орфографии, обеспечивает успешное выполнение первых этапов орфографического действия: нахождения и опознавания орфограммы» [1, с. 115–117].

**Литература**

1 Коваль, Н. А. Проблема формирования орфографической зоркости на уроке русского языка [Электронный ресурс] / Н. А. Коваль // Молодой ученый. – 2022. – № 46 (441). – С. 115–117. – Режим доступа: https://moluch.ru/archive/441/96318/. – Дата доступа: 16.05.2023.

***К. В. Уніятава***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ВОБРАЗ ІНТЭЛІГЕНТА Ў ПОЗНІХ АПОВЕСЦЯХ ІВАНА ШАМЯКІНА

Складаныя і супярэчлівыя змены ў грамадстве канца 1980 – пачатку 90-х гадоў былі ўспрыняты пісьменнікам неадназначна. Мастак сацыялістычнага светапогляду, ён не разумее і не прымае новых адносін паміж людзьмі. Шамякіна-пісьменніка пакідае гістарычны аптымізм, які быў уласцівы ўсёй яго папярэдняй творчасці. Вялікая роля ў позніх аповесцях І. Шамякіна належыць вобразам герояў-інтэлігентаў (мастакоў, артыстаў, вучоных). Яны людзі неабыякавыя, балюча перажываюць тое, што здарылася з некалі вялікай краінай і што адбываецца навокал. Галоўны герой твораў “Paradies auf erden” і “Вернісаж” – пісьменнік-інтэлігент Іван Андрэевіч – так характарызуе сучаснае яму грамадства: “Хаос. Не, не хаос. У хаосе ёсць завяршэнне, пачатак і канец… А я не бачу канца нашага развалу. Чым далей, тым большая памыйка” [1, с. 261]. Прататыпам гэтага героя з’яўляецца сам Іван Пятровіч Шамякін, а персанаж – немалады ўжо пісьменнік – становіцца яго аўтарскім голасам. Ён агучвае сваё разуменне творчых праблем, сучаснай яму рэчаіснасці.

Запыт на духоўнасць у тагачасным грамадстве імкнуўся да нулю, таму пісьменнік паказвае болевыя кропкі соцыуму праз герояў-інтэлігентаў, якія апынуліся ў цяжкіх умовах жыцця на гістарычным раздарожжы. Так, герой-пісьменнік Іван Андрэевіч з аповесці “Paradies auf erden” змушаны гандляваць на праспекце аўтарскімі экземплярамі кніг, вядомы мастак Міхаіл Рачыцкі – прадаваць свае карціны ў замежжа (“Вернісаж”), а народная артыстка зноў просіцца выйсці на тэатральныя падмосткі, каб зарабіць на

жыццё (“Адна на падмостках”), знаходзячыся ў сітуацыі беспрасветнай галечы і адзіноты. Кожны з гэтых таленавітых людзей перажывае ўнутраную драму, бо востра адчувае несправядлівасць, расчалавечанасць свету, сябе ў ім няўтульна і бездапаможна.

Такім чынам, пры разглядзе сацыяльна-этычных канфліктаў у аповесцях 1990-х гг. І. Шамякіна вялікая роля належыць вобразам герояў-інтэлігентаў (мастакоў, артыстаў, вучоных), якія паказаны ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Творы пісьменніка на гэтую тэму можна аднесці да рэалістычна-псіхалагічнай прозы.

**Літаратура**

1 Шамякін, І. П. Збор твораў: у 23 т. / Іван Шамякін; падрыхт. тэкстаў і камент. А. Шамякінай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 2011. – Т. 5 : Аповесці 1988–1993 / рэд. тома: Т. С. Голуб, А. М. Макарэвіч. – 622 с.

***М. В. Чавер***
*Навук. кір.* ***К. Л. Хазанава,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ДЫЯЛЕКТНАЯ ЛЕКСІКА Ў МОВЕ РАМАНА ІВАНА МЕЛЕЖА “ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ”

Дыялектная лексіка – гэта словы, выразы, словазлучэнні, якія ўжываюцца толькі ў пэўнай мясцовасці. Функцыянаванне дыялектных лексем абмежавана пэўнай тэрыторыяй пражывання носьбітаў пэўнай мовы, а таму дыялектную лексіку адносяць да тэрытарыяльна абмежаванай лексікі. Дыялектызмы часта трапляюць на старонкі кніг мастацкай літаратуры. Пісьменнікі выкарыстоўваць дыялектную лексіку для стварэння мясцовага рэгіянальнага каларыту, а таксама для індывідуалізацыі мовы персанажаў.

Першы раман трылогіі Івана Мележа “Палеская хроніка” “Людзі на балоце” з’яўляецца яскравым прыкладам трапнага выкарыстання дыялектнай лексікі ў літаратурным творы. Сам выхадзец з Усходняга Палесся, Іван Мележ цудоўна ведаў і адчуваў моўны каларыт родных мясцін, а таму з вялікім натхненнем і густам прапанаваў родныя слоўцы чытачам. Сярод дыялектызмаў мовы рамана выдзяляюцца фанетычныя, словаўтваральныя, граматычныя, лексічныя дыялектызмы.

Фанетычныя дыялектызмы адрозніваюцца ад літаратурных адпаведнікаў пэўнымі гукамі: “*Ці ж я калі **грэбувала**!*” [1]; “*Аб чым **ето** яна?*” [1]; “*Пужаць не **було** каму!*” [1]. Словаўтваральныя дыялектызмы маюць адрозненні ў словаўтварэнні: “*Колькі з ім **папаваждаліся**, каб падняць зноў*” [1]. Граматычныя дыялектызмы – гэта адметныя мясцовыя формы слоў: “***Ганно-о**! Дзе ты, нячыстая сіла?!*” [1]. Лексічныя дыялектызмы – гэта адметныя мясцовыя назвы, якія маюць лексічныя адпаведнікі ў літаратурнай мове: “***Картопля** як **картопля**... Ён сапраўды не заўважыў, смачная ці нясмачная была гэтая бульба*” [1].

З дапамогай дыялектнай лексікі, выкарыстанай у рамане Івана Мележа “Людзі на балоце”, надзвычай дакладна перадаецца моўная атмасфера рэгёна, дзе адбываецца дзеянне, адбываецца яскравая індывідуалізацыя мовы персанажаў рамана. У выніку стылістычнага прыёму выкарыстання дыялектнай лексікі чытач нібы адчувае сябе ў адпаведнай мясцовасці.

**Літаратура**

1 Іван Мележ. Людзі на балоце [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Ivan_Mielez/Ludzi_na_balocie.html. – Дата доступу: 02.06.2023.